ПАД МІРНЫМ НЕБАМ
БЕЛАРУСІ



# МІР І АДЗІНСТВА ЗБЕРАГЧЫ

**Прысвечаны Дню Перамогі ўрок міру ў рамках традыцыйнай грамадска-літаратурнай акцыі «Пад мірным небам Беларусі» правялі гродзенскія пісьменнікі.**

Грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» была ініцыяваная Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ у 2015 годзе. Яна праходзіць у выглядзе творчых сустрэч, вечароў грамадзянскай паэзіі ва ўстановах адукацыі і культуры Гродна і Гродзенскай вобласці. Задача акцыі – з дапамогай мастацкага слова прыцягнуць увагу прадстаўнікоў розных пакаленняў грамадскасці да гістарычнай праўды і грамадзянскага сумлення.



10 мая 2023 года дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі выступіла перад старшакласнікамі Гімназіі № 3 імя Вольгі Соламавай. Людміла Кебіч, Браніслаў Ермашкевіч, Людміла Шаўчэнка, Дзмітрый Радзівончык і Таццяна Лашук пабудавалі сімвалічны мост паміж рознымі пакаленнямі беларусаў, абраўшы літаратуру ў якасці будаўнічага матэрыялу для яго. Прагучалі творы з грамадзянскай і ваенна-патрыятычнай лірыкі на беларускай і рускай мовах. Паэты падзяліліся ўспамінамі і развагамі на тэмы міру і вайны. Людміла Антонаўна Кебіч прачытала ўрывак з уласнага нарыса (кніга «Пакінуць след на зямлі»). Дзмітрый

Радзівончык, акрамя ўласных вершаў, у ролі чытальніка пазнаёміў аўдыторыю з творамі некаторых калег. 86-гадовы ветэран узброеных сіл, паэт Браніслаў Ермашкевіч падарыў свае кнігі бібліятэцы гімназіі і заклікаў слухачоў быць годнымі памяці воінаў-пераможцаў фашызму. Настаўнік гісторыі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Лашук запрасіла сваіх вучняў на сайт абласной пісьменніцкай арганізацыі www.pisateli.by і прапанавала зрабіць урок міру з удзелам літаратараў традыцыяй. Моладзь сустрэла выступленні гасцей з увагай і сяброўскай сімпатыяй, якая ўвасобілася ў апладысментах.

Сустрэча прайшла ў фармаце адкрытага творчага дыялогу. Гасцямі было падкрэслена: важна захаваць мір у сэрцах нашых людзей; мірная стваральная праца, грамадскае адзінства і любоў да Радзімы з'яўляюцца сродкамі супрацьстаяння выклікам нашага няпростага часу. Геравічных прыкладаў нямала ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Такім прыкладам з’яўляецца і наша зямлячка Вольга Восіпаўна Соламава, чыё імя з гонарам носяць гімназія і вуліца, на якой яна стаіць. Скончыўся ўрок экскурсіяй у Музей Вольгі Соламавай і сумесным фатаграфаваннем на памяць.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** Людміла Кебіч, Людміла Шаўчэнка, Дзмітрый Радзівончык, Браніслаў Ермашкевіч і Таццяна Лашук падчас прысвечанага Дню Перамогі ўрока міру ў рамках грамадска-літаратурнай акцыі ГрАА СПБ «Пад мірным небам Беларусі». ДУА «Гімназія № 3 імя Вольгі Соламавай г. Гродна», 10 мая 2023 года.

**Інфармацыя пра Музей Вольгі Соламавай**







Год мира и
созидания
в страну
здоровья
Вредным
привычкам —
«НЕТ»
Родны










ПАД МІРНЫМ НЕБАМ
БЕЛАРУСІ


ПОМНИТЬ,
ЧТОБЫ ЖИТЬ
НИКТО НЕ ЗАБЫТ,
НИЧТО НЕ ЗАБЫТО

